БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
Серпухоуская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 до 2 гадз. пасьля поудня.
Адміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз.
У вечары ад 5 да 7 гадз.

Рэдакцыя пакідае за сабой права папрауляць перасыланые рукапісы і корэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 К.

Падпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак:
за верш пэтыту на 1-й стран. 1 руб
на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 32. Менск. Аўторак 30 красавіка 1918 г. Год I

Менск 30/IV.

Без гаспадара.

Беларусь перажываець тра-чны момэнт сваей гісторыі. Гэта есьць нацыя са старой аей уласнай культурай, каторая даўней праз вякі была моцнай незалежнай дзержавай разам с літвінамі. Цяпер яе дзеляць суседзі як этнаграфічную массу, ні лічучыся ні з беларускім народам, ні з яго нацыянальнай ідэей, ні з арганізуючымся цэнтрам беларускага ураду—Радай.

Ездзюць у Кіеў беларускія дэлегаты, як бедныя загродовыя шляхты, страціўшыя свае паранскія паперы, да багатага пана на паклоны. Але багаты пан, умеў папасьці у ласку, дзе трэба, і акругляець свае землі за рахунак суседзяў, тымчасова аслабеўшых.

Малая Літва тое самае робіць з беларускай Віленшчынай. Вінавацiць нашых суседзяў у гэтых захватах кавалку безгаспадарскай зямлі беларускай мы ні можам. Гэтаго ні будзе, калі будзе Беларуская дзержаўная улада. Усе гэтые выпадковыя заборы ніякой юрыдычнай падставы ні маюць, узяты яны ці правам вайны, бо мы с суседзямі ні ваевалі, ні узаемным дагаворам а такія іншэ будуць некалі, і скончацца, мусі быць, добрасуседзкай згодай.

Фундамэнты Беларускай дзержаўнасьці.

Мястэчкі і воласьці пачынаюць ужо самі заводзіць у сябе парадкі, самаўпраўленне. Але многа іншэ валасьцеў ні ведаюць як прыступіць да гэтай працы. Дзе есьць больш інтэлігэнцыі, там ужо мэханізм валасны налажываецца. Але у палавіне валасьцеў усе іншэ чакаюць прыказу, што і як рабіць.

У большых, цэнтрах там гдзе ужо есьць органы і аппараты упраўлення акупацыйныя уласьці імі карыстаюць. У валасныя і мястэчковыя упраўленні можна пусьціць толькі мейсцовых людзей, знаючых варункі насялення. Без мейсцовых самаўпраўленняў ні можа правільна функцыяніраваць ніякая уласьць. Патрэбен міравы суд, міліцыя, адміністрацыя усяго павету. Школы, падаткі і г. д. Трэба рэгуляраваць адносіны людзей між сабой, адносіны да валасьцеў, краю. Усе гэта прывясьці у стройную сыстэму, зрабіць нейкі цэнтр вышэйшай уласьці, хаця бы гым часам па справам мейсцовага самаўпраўлення. Трэба, каб Беларусь, і без таго цяжка пацярпеўшая ад вайны і рэвалюцыі прыйшла у нармальны стан ізноў, а то яна можа саўсім замерці.

Рада Рэспублікі павінна усімі гэтымі жыццевымі і надкладнымі справамі заняцца, як найхутчэй у паразуменні с акупацыйнымі уласьцямі. Другого цэнтру для гэтаго німа апрыч Рады Рэспублікі.

Рада Рэспублікі наследавала свае правы на дзержаўнасьць ад Усебеларускаго конгрэсу, разагнанаго большэвікамі. А на конгрэсе гэтым было 1700 прэдстаўнікоў ад валасьцеў, мястэчак, паветоў і другіх беларускіх інстытуцыяў. Зьехалася уся Беларуская зямля можа першы раз за тысячу гадоў. Былі з валасьцеў сумежных с Пскоўшчынай на поўначы і з селаў беларускіх, сумежных с палудзеннай Украінай. Ні адна нацыя у бывшай Імпэрыі ні зрабіла такого поўнаго зьезду. Значыць беларусы маюць такую культурную і дзержаўную сьпеласьць, як ні адзін з суседніх народаў. Гэта даець нам цьвердую веру, як скала, што будзе жыць нідзелімая і дзержаўная Беларусь.

„Рэяльная палітыка“.

Паказаўшыся пад такім аглаўкам у № 8-м «Dz. Min.» артыкул сьведчыць аб новым паглядзе на «Крэсовую» палітыку, які дазравая у мысьлях месцовых польскіх дзеячоў.

Мае яна быць дарогаю да найлепшага «нацыянальнаго і грамадзянскаго бытавання» і лічыцца з тым што ёсць у самой рэчы. Такую палітыку можам хіба толькі вітаць.

Але нам здаецца што артыкул мае апрача паведамлення для польскаго грамадзянства яшчэ і другі характэр і ён з'яўляецца як бы пробнай галай, пусьціўшы каторую мейсцовыя польскія дзеячы хацелі даведацца аб настрою пануючым сярод беларускаго грамадзянства. У ім есць нікаторыя пункты якія самі сабой высоўваюцца на мейсца пунктаў будучай умовы патрэбнай для супольнай працы. Разгляд памянёнаго артыкулу з гэтаго боку можа быць надта цікавым.

Што-ж абяцаюць беларусам? С чым прыходзяць да нас нашыя тутэйшыя палякі?

— Абяцаюць «знайсьці спосаб да супольнаго жыцця з беларусамі». Прыйходзяць з бажаннем злучыць на Беларусі ідучыя у разброд і па рожнаму глядзючыя у прошласьць (а ні на будучыну?) станы: землеўласьнікаў, якія стаяць цяпер пад знакам запытання, мешчанства, толькі пачаўшаго жыць і працуючаго люду, цёмнаго і ніразьвітаго, каторыя усе маюць проціў сябе сільных і узапашаных у способы для змагання ворагоў.

Абяцаюць іншэ што пры гэтым злучэнню найбольшыя афяры панясе найвыжэйшы стан.

С такімі дарамі з добрай волі хочуць прыйсьці да Беларусаў тутэйшыя палякі. Трэба сказаць што дары вялікія і моў дыхт такія аб якіх мы сабе думаемо, але... але той выкуп, які сабе за гэтыя дары вымагаюць нашыя «рэяльныя палітыкі» можа хіба лішні раз абразіць беларусаў, а ні «залагодзіць ненавісьць», каторай і па-праўдзі ні трэба было-б.

Мы разумеям канечне, што паляк ніколі ні перастане быць паляком, вялікарус-вялікарусам а жыд жыдам. У кожнаго з іх былі і будуць свае нацыянальныя ідэалы, ад каторых барані нас Божа каго нібудзь адвучаць—мы *за надта* пазналі смак гэткаго адвучання на сабе. І дзеля гэтаго мы лічым патрэбным забеспечэнне прэдстаўнікам кожнай самешканай на Беларусі ні беларускай нацыянальнасьці магчымасьці захавання і разьвіцця свайй нацыянальнай культуры, і атрымання належнай часьці з матэрыяльнаго прыбытку краю.

Гэта вымагаецца нават нашым разуменнем агульнаго краёваго дабра, каторае па нашаму можа толькі выйграць ад вольнаго споўпрацацаўніцтва подлуг з Беларускай іншэ і другіх культураў.

Але нашыя мейсцовыя палякі прыходзяць да нас ні толькі для такой супольнай і братэрскай працы, аглядаючыся назад, на другіх яны кажуць што іх прыход гэта толькі «лічэнне з тым што есьць і лапасаванне мэтоду рэяльнай палітыкі да варункаў данай хвілі і ні азначае саўсім іх высьвечання і прызнання вечнымі». Яны адкідаюць, як крыўдзячую іх ацэнку гэтаго становішча за «абцінанне народовай ідэі, за звужанне пэрспэктывы уселякіх здабыткаў і карысьцяў ў палітыцэ». Яны запэўняюць, што гэта толькі рожніца у мэтадзе чыннасьці, а саўсім ні рожніца ў мэтах, «каторыя па-суці могуць быць аднаковымі».

«Варункі данай хвілі, гэта глаўным чынам нацыянальнае прабуджэнне беларускаго народу і яго умацаванне ў кірунку стварэння беларускай дзержаўнасьці—гэтак мы разумеям. Калі яны для нашых тутэйшых жыхароў ні маюць быць ані паважанымі (дзе ужо хацець «usgwéicaia»), ані прызнанымі вечнымі, якім жа чынам яны прыйдуць да паразумення з беларусамі, для каторых гэтыя «варункі хвілі» маюць наістотнейшае значэнне?

Народовая ідэя Беларуская ніколі ні згодзіцца с такой жа ягеллонскай ідэяй, а як мы ведаем толькі ягеллонская ідэя і панавала у мысьлях польскіх палітыкаў да апошняго часу. Калі гэта ідэя і надалейшае будзе кіраваць іх працай, што-ж тады будзе за «супольнае жыццё»? Усе што тварыціме беларуская ідэя, будзе бурыцца ягеллонскай ідэяй, каму-ж з гэтаго карысьць?

Прыпадкова прыкладам такой нікарыснай працы з'яўляецца і цяпер нават самы артыкул у «Дзенніку», у каторым аўтар, крытыкуючы «найблізшы і найрэйяльнейшы» постулат мейсцовых палітыкаў, закідае ім, што за гэты постулат трымаецца нівялікая група грамадзянства, а паспольство адносіцца да яго «альбо ніякова, альбо нават з непрыязьню». У звязку с часам калі гэта пішацца, гэта прыпамінае нам тыя спэцыяльныя інформацыі, якіе з рускаго і польскаго боку атрымоўваюць Бэрлін і Вена аб магчымасьці творчай дзержаўнай працы на Украіне.

Столькі аб «рэяльнай» палітыцэ. Рэяльная іншая палітыка толькі тагды карысна народу і заслугоўвае на пашану, калі яна ў дадатку шчырая палітыка.

Такої шчырасьці ў палітыцэ Беларускі народ знаходзячыся у трагічнейшым можа момэнце ўсёй яго гісторыі можа зажадаць сабе хаціб ад той часткі палякоў, каторыя з'яўляюцца тутэйшымі з крыві і косьці даўнейшымі баярамі беларускімі. **П.**

Харчовае пытанне у сусьветнай вайне.

Спусташэне вялікіх абшараў, ці німагчымасьць вясьці на іх палявыя работы, дзякуючы звязаным з вайной апэрацыям, а так сама прызыў у войска вялікай лічбы работнікаў, які адбірае у сельскай гаспадаркі патрэбныя ей рабочыя сілы, маюць заўседы сваім скуткам для ваюючых старон зменшэнне вырабу харчовых прадуктаў.

Харчовыя труднасьці гэтай вайны, дзеля яе сусьветнаго характару, даюць адчуваць сябе у шмат значнейшай меры чым у часе папярэдніх войнаў.

Праз уцягванне для простаго ці з'убочнаго прычынку у вайне усе новых народаў абшар ніўпраўленай зямлі, дзякуючы паказаным прычынам робіцца усе большым і гэта тым болей, што у вайну уцягнуты ні толькі патрэбляючыя, але і пастаўляючыя харчовыя прадукты краі.

Нават Злучаныя Штаты Поун. Амэрыкі, усяго нідауна умешаушыеся у спрэчку і да вайны вывозіушыя аграмадную лічбу пудоу хлеба у Эуропу, ні могуць здаволіць цяпер уласнай патрэбы.

Харчовыя труднасьці асабліва адчуваюцца у тых густазаселяных мейсцовасьцях, каторыя ні могуць пражыць уласнымі запасамі і да каторых падвоз прадуктау з другіх мейсцау ні можа ісьці жаданым тэмпам, праз заняцце ж. д. ваеннымі перавозкамі і іншыя, зьвязаныя з вайной прычыны.

Каб усе да гэтаго часу так ніашчадна спажывалі прадукты, як і да вайны,—у скутку гэтаго быу-бы усесьветны голад. У прэдбачэнню гэтаго найлепшым было усю справу народнаго харчавання перадаць з прыватных рук у гасударсцьвенае заведванне, што зн. зрабіць агульную перапісь харчовых прадуктау, зрабіць на іх сталыя (цьвердыя) цэны, даць магчымасьць насяленню атрымоуваць іх оез пасрэднікау і, законам устанавіушы харчовую пайку, забэзпечыць кожнаго чалавека пракормам.

Такія справядлівыя, зрауноуваючыя усіх перад правам на жыцце і разам с тым мудрыя способы прыменяліся Цэнтральнымі дзержавамі блокірованымі Англіяй і іх хаурусьнікамі у працягу нескольких гадоу у скутку чаго Цэнтральныя дзержавы, якія зауседы з'яуляюцца патрэбляючымі і доугі час ні мелі прывозу, могуць з легкім сэрцам слухаць аб прыгрозах непрыяцеля пакараць іх голадам.

Менская губ., уходзіушая у склад Рускай імпэрыі, каторая нікольki ні мела добрай дзержаунай гаспадаркі, безразсудна агалачалася рускім фронтам, і у канцы дазнаушая хадзяйнічання большэвікоу, апынілася ужо дауно у цяжкім харчовым палажэнні, каторае магло-б ішчэ пагоршыцца, калі-б дапусьціць, каб усе ішло так як раней ішло.

Едыным ратункам перад горшай ішчэ доляй з'яуляецца завядзенне і на Меншчыне тых самых харчовых парадкау якія ужо 4 гады істнуюць у Нямеччыне, Аустра-Вэнгрыі і інш. дзержавах.

Усякі, хто ні думае толькі аб сабе, павінен згадзіцца с тымі самаагранічэннямі, якія аднак пазволяць быць сытаму і таму, хто мае больш грошы, і таму у каго іх саусім скупа.

Абразкі с правінцыі.

(Па даугінаускаму гасьцінцу.)

Захажу у суседнюю веску, дзе ні быу ужо пару гадоу. Хаткі тыя самыя. Крывыя, аорослыя мохам. Толькі дзе-ні-дзе спатыкаюцца сьляды «волі»—дабудаваныя да старой хаткі пабюсянькія трысьцяні, сенцы, сьвіран, хлячук. Або у каго над паветкап прыгатованы некалькі смалістых, сьвежых, сасновых бярвенняу, ці новыя дошкі над паветкай.

Сходкі – сходкамі, камітэты —камітэгамі, воля—воляй, а тут калі «гітатары» (агітаторы) кажуць, што можна рубаць панскі ці скарбовы лес, дык і ні дзіва, што рупны гаспадар ні мог устаяць проціу пакусау, каб ні дабудоуваць і направіць сваю курную пагніушую хатку?..

У самых найспакайнейшых старых часох жыла у народзе пагаворка: «Хто у лесі ні злодзей, той дома ні гаспадар». А цяпер кожны с такіх «добрых» гаспадароу с трывогай пазірае на сасновую бель на сваім дзядзінцу.

Гэтыя белыя відочныя азнакі іх праступкау выедаюць ім вочы цяпер... Гэтыя новыя бярвенкі у сьценах старых хацінак відочныя для усіх, нібы грэх, напісаны на тзару грэшніка Самім Гаспадарам-Богам... Як тыя авечкі селяне чакаюць карау сваіх за усе гэта...

Расказалі мне, што з адной вескі у час «волі» пазнашы у лыкі. Гэта ні хаха ... якія дарэмна падзерці лыкі с панскага лесу. Большаго скарыстання ад «волі» як новыя дарэмныя лапці бедныя людзі прыдумаць сабе ні маглі...

Кожны малюе сабе рай па свойму.

З.

Агульныя весткі.

КОНСТАНТЫНОПОЛЬ. 27 гм. Подлуг турэцкаго комунікату, на палестынскім фронце, мейсцовыя стычкі патрулёў. Каля Наблі туркі зьбілі непрыяцельскі самалёт. Лётнік узяты у палон, дазорны забіты. На Каукаскім фронце туркі узялі фортэцыю Карс, пры чом ім дасталося 860 гарматаў рожнаго калібру.

ЖЭНЭВА 25 гм. «Вольф». Ваенны крытык парыжскаго «Iournal» піша, што Льос Калэ і Дюнкерка ніразрыуна зьвязаны з льосам Іпру. За Іпрам німа ужо болей ніякіх новых і лепшых сталых лініяў абароны. Тыя што ёсьць могуць служыць толькі для часовай апоры.

БЭРЛІН. 25 гм. «Вольф». «Reuter» паведамляе: дальнабойная гармата і сягоння абстрэльвала Парыж. Адна граната трафіла у 6-ты паверх аднаго з дамоў пры чом цяжка зранен адзін чалавек.

БЭРЛІН. 26 гм. Пасьля заключэння мірнай умовы з Румыніяй імпэрскі канцлер мае выступіць у Рэйхстагу с паведамленнем аб палітычнай сытуацыі, пры том займецца падробна скончэннем для Нямэччыны усіх усходніх пытанняў, якія выходзяць з заключэння міру з Румыніяй.

ЛУГАНО. 27 гм. Італьянскі габінэт міністраў атрымаў у палаце дэпутатаў вотум зауфання 272 галасамі проці 43.

ЛЕНДАН. 25 гм. «Вольф». «Reuter» паведамляе, што лёрд Ротермэр пакінуў службу гасударсцьвеннаго сэкрэтара авіяцыі.

БАЗЭЛЬ. 26 гм. Аг. Гавас паведамляе з Вашынгтону аб назначэнні генэрала Брайса главным дарадчыкам лёрда Реддінга у вайсковых справах і шэфам усіх ангельскіх ваенных міссіяў у Злучаных Штатах.

ВЕНА 26 гм. «Вольф». Міністр загранічных спраў бар. Бурыян і статс-сэкрэтар ф. Кюльман, разам с праводзячымі ім асобамі у пятніцу вечаром выехалі у Будапэшт.

БУДАПЭШТ 26 гм. «Вольф» Вэнгерская палата дэпутатаў прыняла двух-месячны часовы бюджэт.

БЭРН. 26 гм. Подлуг выданаго ген. Пэршынгам першаго сьпісу стратаў панесеных амэрыканцамі у бітвах палягло 181, згінулі пры нішчасьлівых выпадках 153, ад хвароб памёрло 785, на моры загінуло 237, ад уселяк. прычынаў 37; усяго памерло 1404. Раненых 780, папалі у няволю 22, згубіліся без ведама 41.

ГААГА 25 гм. «Вольф.» Подлуг вестак з Лёндану прычыны адстаўкі міністра Мотоно мае хіба зьвязак з выступленнем Японіі у Сыбіру.

На беларускім шляху.

Курсы Беларусазнаўства (Захароўская 43),

Адчыненыя па ініцыятыве Беларускай Субкамісьі па народнай асьвеце Менскай сталічнай Думы, маюць аграмадны усьпех. Запісываецца на курсы вельмі шмат людзей. Сярод лектароў значацца самыя вядомыя палітычныя і культурныя беларускія дзеячы, як: А. А. Смоліч (Народны сэкрэтар асьветы), Я. Я. Воронка (Старшыня Народнаго Сэкрэтарыяту), Я. Ю. Лёсік (рэдактар газ. «Вольная Беларусь»), А. Н. Уласаў (рэдактар б. газэтаў «Наша Ніва», «Саха» і «Лучынка»), а таксама прафэс. Масоніус. Лепкоускі, Кодзіс, Косьцевіч. Аўсянік і шмат іншых.

Склад аўдыторыі— самы разнародны: тут і сталыя людзі з унівэрсытэцкімі значкамі і малаграматныя падросткі і студэнты б. расійскіх вышэйных школ, і гімназісты, па нацыянальным азнакам большая часьць слухачоў беларусы, затым у меньшасьці ідуць па парадку: еўрэі, вялікаросы, палякі і украінцы,

* * *

На ініцыятыве аднаго віднаго беларускаго палітычнаго дзеяча у хуткім часе у Менску адчыняецца асобая школа —Беларуская Грамадзянска-Навуковая Колегія, яе мэта—падгатовіць опытных і асьвядомленных у беларускім пытанні працаўнікоў дзеля кіравання нарастаючымі беларускімі грамадзянскімі і адміністратыўнымі установамі.

Поўны курс колегіі—два месяцы: На 1 курс будуць прымацца мужчыны і кабеты с цэнзам адукацыі ні ніжэй шэсьці клясоў б. расійскіх сярэдніх школ. Плата за курс Колегіі—200 руб. У Колегіі будуць вучыць па асобай сістэме (бясед і рэпэтыцыі). Скончыўшым Колегію с дазволення Народнаго Сэкрэтарыяту будуць выдавацца дыплёмы, па якіх колегісты будуць мець асобыя правы і першынствы пры заняцці разных пасад у установах Рэспублікі.

* * *

Асобая камісія па устанаўленню эмблем і ўнешніх азнакаў пры Нар. Сэкрэтарыяце Бел. Нар. Рэспублікі апрацовывае цяпер Дзержаўны штандар Рэспублікі. Вельмі шкодзіць у гэтым кірунку тое, што літвіны, ні маючы ніякай нацыянальна-палітычнай эмблемы у відзе штандара, запазычалі нікаторыя эмблемы у беларусаў. Як вядома, тэрмін «Літоўская Русь» ужываецца у тэрыторыяльным уразуменні і ніколі—ні істнаваў тэрмін «Руская Літва»; разам з ніпраўдзівым тлумачэннем першаго тэрміну літвіны і прэтэндуюць на правы аграмаднай большасьці (с самых старых часаў нацыянальнай і культурнай)—беларусаў.

* * *

20 красвіка адбылося другое заседанне прэдстаўнікаў Беларускаго і Украінскаго урадаў па пытанню аб улажыванні дзержаўных межаў. Главнае пытанне—канечныя пункты на усходзе і захадзе. Украінская дэлегацыя прапануе лічыць заходнім пунктам Выганоўскае возеро і намечае граніцу на паўночнай старане ад жалезнай дарогі П і н с к- Г о м е л ь. Старшыня Беларускай дэлегацыі протэстуе проціў гэтаго і кажа, што Выганоўскае возеро ні можа быць апошнім пунктам Беларуска-Украінскай Граніцы на захадзе. Належнасць району Прыпяці да Беларусі—варунак sine gnanon. Гэта пытанне жыцця і сьмерці для маладой Рэспублікі. Украінская дэлегацыя на гэта адказывае, што граніца да Выганоўскаго возера праведзена Бярэсьцейскім дагаворам, а пераінач ыць яе дэлегацыя ні згаджаецца.

Заседанне адкладваецца дзеля разбору гэтаго пытання у камісьях.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоўнаго камандавання за 29 красавіка 1918 року.

З А Х А Д: У Фляндрыі ад палудня рухавы артылерыйскі бой. С часу, як забраны Кеммель, намі забрано больш як 7100 палонных, між імі 181 афіцэр, 53 гарматы і 233 куляметы. Міжы каналам Ля-Бассэ і Скарпаю, а так сама паўночней Соммы мацнейшая дзейнасьць ангельцаў. Моцныя дзе-ні-дзя атакі французаў на лес і веску Ангар былі адбіты.

Больш на фронці нівялічкія стычкі на шмат мейсцоў. На усходнім беразі Маасу наша атака прынесла пам палонных.

З іншых тэатраў вайны ніякай навіны.

Першы-Генэрал-кватэрмэйстар **фон-Людэндорф**.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Эвакуацыя афіцэрау, дохтароу і ваенных чыноунікау ужо пачалася: у Расію штодзенно па 50 чал., у Польшчу, Літву і Прыбалтыку—меньшымі партыямі, ні лічучы сямействаў. Пасьля запісі у афіцэрскім бюро, кожны павінен праз суткі выехаць, іначэй—улада паступае з ім як з невыпауняючым свайго абавязку. Падпіска аб невыступленні проціу немцау ні бярэцца. Доля установау, створаных афіцэрскім бюро: афіцэрскія прыпынкі, харчавыя пункты, майстэрні і др.) выявіцца у хуткім часе. Усяго афіцэрау у Менску да 3,000 ч.

У губэрнскім прысутствіі па загаду нямецкаго гораданачальніка ад 1-го маю закладаецца другі аддзел—па выкупных і чыншавых справах. У гэтым аддзелі будуць разьбірацца і сэрвітутныя справы.

У казеннай палаце служачыя чэкаюць і дачэкацца ні могуць пэнсіі, назначанай ім у палавінным разьмеры. А есьці мабыць, і ім хочацца!

Пэнсыю за красавік пуцевым служачым Л.-Р. ж. д. да станцыі Уза выплачываюць з нямецкай казны, на далей і жалезнадарожныя артэльшчыкі будуць атрымліваць грошы з гэтай самай казны.

Арэндную плату ад арэндатарау зямель, глядзючы на камароускаго землеуласьніка Ваньковіча, пачалі вымагаць амаль ні па усяму гораду: на зямлях прычтоваго духавенства і прыватных уласьнікау, апрача толькі насьледнікау Неморшанскіх—у 4 часьці горада у районе Койданоускаго тракту.

Вымагаюць, каб зараз—жа унесьлі нідаімкі за увесь час вайны і за 1918 г., іначай—зноска дамоу і высяленне...

Рынычныя цэны за 29 красавіка.

Целяціна —	$2\frac{1}{2}$ р. —	фунт.
Сыр	15—16 р. —	шт.
Яйкі — —	$3\frac{1}{2}$ р.	дзесят.
Масло— —	12 р. —	фунт.
Шынка —	6 р. —	„
Малако —	$1\frac{1}{2}$ р.	кварта.
Парася —	25 р.	штука.
Каубаса —	5 р. —	фунт.
Сало — —	$7\frac{1}{2}$ р. —	„
Дровы (бяр.)	30 р. —	воз.
Сено — —	14 р. —	пуд.

Курсы беларусознаўства.

сягоння 30 красавіка лекцыя Я. Я. Воронкі: «Беларусь і яго суседзі».

Пачатак а 7 гадз. у веч.

Рэдактар **А. Прушынскі**.

Выдавецтво **Т-во «Заранка»**.